**У. І. КУЛІКОВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта

# МАТЭРЫЯЛЫ для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры

**Сёння часта даводзіцца чуць, што нашы вучні не імкнуцца да самаўдасканалення, не жадаюць спазнаваць сакрэты беларускага слова і праз яго развіваць свае творчыя здольнасці. Мушу часткова з гэтым пагадзіцца. У асобных навучальных асяродках падобную сітуацыю даводзілася назіраць і мне. Найперш там, дзе настаўнік ішоў на сустрэчу з выхаванцамі і не прааналізаваў належным чынам сутнасць практычных заданняў, не асэнсаваў алгарытм магчымых адказаў, не вызначыў стратэгію тлумачэння кожнай прыватнай задачы. Паверце, без гэтых складнікаў заняткі можна лічыць неэфектыўнымі. Пасля іх вучні, магчыма, тое-сёе запомняць, але ці пажадаюць шчыра, натхнёна карыстацца беларускай мовай у штодзённым жыцці? Ці захочуць прыйсці да вас на факультатыў, каб сумеснымі намаганнямі дасягнуць поспеху на алімпіядзе?**

**Адказ на гэтыя пытанні зможаце атрымаць, калі разам з дзевяцікласнікамі (а менавіта на іх разлічаны матэрыял) паразважаеце над фармулёўкай заданняў, частка якіх выкарыстоўвалася на інтэрнэт-алімпіядах Мінска ў 2014 г., над пошукамі правільных адказаў, прааналізуеце структуру напісанага водгуку і паспрабуеце на пачатковым этапе па такой жа схеме напісаць водгук самастойна — разам з вашымі вучнямі. Пасля абмеркавання варта прыйсці да агульных высноў. Паспрабуйце… Веру, што поспех будзе!**

### Заданні

**1.** Адзначце нумары сказаў, дзе націск у падкрэсленых словах падае на трэці склад. *(Максімальны бал — 4.)*

1. Побач, за елкамі — нацэленыя на акружаных, <u>зарадаваныя</u> сатанінскай радасцю, паліцаі і фашысты заселі ў хмызняку.

2. Шлях там, дзе трэба перайсці яго, чыста пясчаны; сляды на доўга <u>пасыпаным</u> і раўнаваным дажджом шляху выдадуць нас, падкажуць блакадзе, куды пайшлі мы.

3. Тады <u>навыперадкі</u> хлопчыкі і дзяўчаткі насілі, стараючыся назбіраць найсушэйшых дрэўкаў.

4. Тут дзяўчаты і хлопцы, хаваючыся, <u>радзіліся</u> і грэліся.

5. Асноўныя формы <u>галаўных</u> убораў вядомы з часоў Кіеўскай Русі.

**2.** Адзначце нумары радкоў, дзе ва ўсіх словах пішацца літара *о*. *(Максімальны бал — 3.)*

1) Выс..каідэйны, п..літэхнічны, св..еасаблівы, н..ваўведзены;

2) ст..гадовы, ф..тапейзаж, к..нтрмеры, в..дамерны;

3) в..семсот, к..паскладальнік, п..ўнаметражны, пр..ціатамны;

4) сваб..далюбівы, чатыр..хметровы, м..таролер, м..ватворчасць;

5) ч..рнарабочы, шт..дзённа, ст..клетачны, ф..таоптыка.

**3.** Патлумачце, чаму запазычанае з грэчаскай мовы слова «океан» ператварылася ў беларускім маўленні ў слова «акіян». *(Максімальны бал — 4.)*

**4.** Ад прыведзеных назоўнікаў з дапамогай суфікса *-ск-* утварыце прыметнікі і запішыце згодна з правіламі арфаграфіі. *(Максімальны бал — 4.)*

1) Крывіч — ____________________;
2) Сілезія — ____________________;
3) Баранавічы — ____________________;
4) рамеснік — ____________________;

5) Ірак — ____________________;
6) грамадства — ____________________;
7) латыш — ____________________;
8) начальнік — ____________________.

**5.** Укажыце групы прыметнікаў, ад якіх не ўтвараюцца формы ступеней параўнання. *(Максімальны бал — 4.)*

1) Белы, смелы, добры, высокі, таленавіты;
2) шчодры, дарагі, ветлівы, зялёны, рэдкі;
3) бэзавы, босы, замужняя, драўляны, глухі;
4) жывы, двухгадовы, лысы, чорнабароды, нямы.
5) агністы, пярэсты, чорны, светлы, старажытны.

**6.** Адзначце нумары сказаў, у якіх назоўнікі маюць канчаткі, не адпаведныя норме. *(Максімальны бал — 4.)*

1) Над ракой ляціць дружны крык гусей.
2) Зразумела, ніякіх вокнаў не было, толькі адна дзірка, якая служыла дзвер'ю.
3) Міхась напаіў коняў, пасля выкупаўся ў возеры.
4) Чаму шмат на гэтым вабным свеце бед і гораў, слёзаў і пакут?
5) Ільля дастаў з рукзака паўбохана хлеба, шматок сала, бляшанку кансервы.

**7.** Да якога разраду адносіцца займеннік у сказе *Для дзяцей кожны дзень, праведзены ў школе, быццам свята.* Адзначце. *(Максімальны бал — 1.)*

1) Указальны;
2) зваротны;
3) неазначальны;
4) адносны;
5) азначальны.

**8.** Дзеясловы *гасцяваць, драмаць, дзяўбці, гасціць, церці, пячы, ламаць, есці* запішыце ў форме першай асобы адзіночнага ліку. *(Максімальны бал — 4.)*

Я ____________________
____________________.

**9.** Устанавіце адпаведнасць паміж пропускамі ў сказах і словамі. *(Максімальны бал — 4.)*

А___, Б___, В___, Г___, Д___ .

| | |
|---|---|
| А) Алеся любіць музыку, ... яна часта ходзіць на канцэрты. | 1) з кім |
| Б) Я часта бываю ў парку, ... люблю гуляць. | 2) што |
| В) Глеб ведае, ... ён будзе рабіць заўтра ўвечары. | 3) таму |
| Г) Невядома, ... смяюцца гэтыя людзі. | 4) бо |
| Д) Вы не ведаеце, ... ён гаварыў? | 5) з чаго |

**10.** Прачытайце аб'яву. Адзначце, што мусіць рабіць чалавек, калі ён правільна зразумеў яе сэнс. *(Максімальны бал — 4.)*

Бібліятэка будзе выдаваць падручнікі па гісторыі Беларусі для вучняў сёмага класа ў сераду і чацвер у першай палове дня.

1) Вучні могуць узяць падручнікі ў сераду і чацвер па абедзе.
2) Вучні могуць узяць падручнікі ў сераду і чацвер да абеду.
3) Вучні могуць узяць падручнікі ў сераду і чацвер на працягу дня.
4) Вучням не выдадуць падручнікі ў сераду і чацвер.
5) Вучням можна атрымаць падручнікі ў сераду і чацвер зраніцы.

**11.** Пра якое слова ідзе гаворка ў тэксце? Адзначце. *(Максімальны бал — 1.)*

1) Імпрэза;
2) арэлі;
3) амбасада;
4) альтанка;
5) коўзанка.

Першапачаткова гэтым словам называлі фрагмент пабудовы, які выступае ў выглядзе архітэктурнай дэталі, — высокі балкон. Крыху пазней (XVII—XVIII стст.), у эпоху Барока, для якой характэрна ўрачыстасць, кантраснасць, ускладненасць форм, параднасць, пышны дэкор, калі ў Еўропе актыўна пачалі праектаваць паркі, ім сталі абазначаць любую пляцоўку, выступ, адкуль можна любавацца краявідам, а затым і драўляную ці мураваную дэкаратыўную пабудову для адпачынку, што ставілі, як правіла, на ўзвышшэнні ля берага возера або ракі.

**12.** Які са сказаў павінен быць першым у тэксце? Адзначце. *(Максімальны бал — 1.)*

1) Усюды ўжо гуляла сапраўдная вясна, цёплая, зялёная.
2) Памаленьку, але з кожным днём усё смялей і ўладарней наступала вясна.
3) Лета сёлета было познім, але паступова брала сваё.
4) Не спяшаючыся, неяк неўпрыкмет падыходзіла восень.
5) Хоць і нясмела, але зіма нарэшце наступіла.

(1) ... . (2) Снег проста ўвачавідкі асядаў, змрачнеў і адсоўваўся як мага далей ад платоў і прызбаў. (3) Удзень капала са стрэх, паветра вільгатнела, святлела. (4) Ні з таго ні з сяго сярод белага дня галасіста спявалі пеўні, і на пачарнелых сметніках жвава капашыліся вераб'і. (5) На ноч уедліва браўся яршысты марозік, сушыў, сцягваў тонкім празрыстым

лядком лужыны, ранкам церусіў дробны, як манка, сняжок.

**13.** Выберыце варыянты адказаў. Адзначце свой выбар. *(Максімальны бал — 3.)*

Я меў шчасце пазнаёміцца з … сяброўкамі.

1) дваімі вашымі;
2) абедзвюма вашымі;
3) чатырма вашымі;
4) пяцярымі вашымі;
5) дваццаццю вашымі.

**14.** Адзначце нумары фразеалагізмаў, крыніцай з'яўлення якіх стала біблейская міфалогія. *(Максімальны бал — 4.)*

1) Манна нябесная;
2) гады ў рады;
3) з мухамі ў носе;
4) кітайская грамата;
5) казёл адпушчэння;
6) каінава пячаць;
7) збіць з панталыку;
8) несці свой крыж.

**15.** Дапоўніце тэкст рэцэнзіі на кнігу «Руска-беларускі размоўнік» прапушчанымі дзеясловамі. Запішыце гэтыя дзеясловы. *(Максімальны бал — 4.)*

Кішэннага фармату кніжка ________________ мноства цікавых фактаў з гісторыі краіны і народа. Асноўны (практычны) матэрыял ________________ з сямі актуальных раздзелаў: «Агульнаўжывальныя словы і выразы»; «Маўленчы этыкет»; «Чалавек. Асоба»; «У горадзе»; «У магазіне»; «Харчаванне»; «Здароўе і спорт». Такая структура ________________ зручнаму пошуку патрэбнага слова або фразеалагізма, іх беларускіх эквівалентаў. Упэўнены, размоўнік ________________ не толькі рускамоўным асобам, але і нам, беларусам, удасканаліць сваё маўленне і пазнаёміцца з беларускімі самабытнымі словамі і канструкцыямі: *коротать время вечером — вечараваць, лето следующего года — налёцце, перед рассветом — нацямочку, участник застолья, званый гость — бясе́днік* і пад.

**16.** Суаднясіце інфармацыю з правага і левага слупкоў так, каб атрымаліся лагічна правільныя сказы. *(Максімальны бал — 4; 0,5 б. за кожнае правільнае суаднясенне.)*

А__, Б__, В__, Г__, Д__, Е__, Ж__, З___.

| | |
|---|---|
| А) *Багач* — | 1) старажытнае земляробчае свята ў беларусаў і іншых славянскіх народаў, перад якім прыбіралі і ўпрыгожвалі хату і двор «маем». |
| Б) *Вадохрышча* — | 2) царкоўнае хрысціянскае свята, дастасаванае да старажытнага земляробчага свята пад назвай «Зялёныя святкі». |
| В) *Грамніцы* — | 3) старадаўняе земляробчае свята, што спраўлялі пасля заканчэння жніва; сімвал свята — сявенька з жытам ці пшаніцай і ўстаўленай васковай свечкай. |
| Г) *Дабравешчанне* — | 4) старажытнае земляробчае свята славян, якое адзначаецца ў кастрычніку як свята заканчэння палявых работ. |
| Д) *Пакровы* — | 5) зімовае свята народнага календара, другая назва якога — *Стрэчанне.* |
| Е) *Сёмуха* — | 6) язычніцкае веснавое свята ўсходніх славян, звязанае з культам продкаў, дзень памінання памерлых. |
| Ж) *Тройца* — | 7) старажытнае веснавое свята народнага календара, якое называюць яшчэ Звеставанне, у час якога «дзеўка касу не пляце, птушка гнязда не ўе». |
| З) *Радаўніца* — | 8) зімовае свята народнага календара, якім завяршаліся Каляды. |

**17.** Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы прапушчаныя займеннікі. *(Максімальны бал — 6.)*

1. Зарубіць ________________ на носе.
2. Чуць на ________________ вушы.
3. Не з ________________ рукамі.
4. На ________________ лады.
5. Скінуць з ________________ ветхага Адама.
6. Перарабіць на ________________ капыл.

**18.** Падбярыце да кожнага слова азначэнне, якое б выяўляла прыналежнасць гэтага слова да пэўнага роду або адсутнасць катэгорыі роду. Запоўніце табліцу. *(Максімальны бал — 6.)*

| Слова | Азначэнне | Род |
|---|---|---|
| посуд | | |
| плеш | | |
| горыч | | |
| небарака | | |
| абцугі | | |
| каліва | | |

**19.** Прачытайце ўважліва тэкст адзін раз. Затым адкладзіце яго і пастарайцеся адказаць на пытанні, што прапануюцца пасля тэксту. *(Максімальны бал — 7.)*

**Лáзня**

Стварыць спецыяльныя месцы, дзе можна памыцца і папарыцца, нашы продкі пачалі ў V—VI стст. Ва ўсякім разе, у адным з персідскіх рукапісаў той пары адносна пабудовы такіх памяшканняў гаворыцца: «Славяне робяць жытло пад зямлёй, так каб холад, які бывае наверсе, іх не даставаў. І ён [славянін] загадаў, каб прынеслі шмат дроў, камянёў і вуглю, і гэтыя камяні кідалі ў агонь, і на іх лілі ваду, пакуль не пайшла пáра і пад зямлёй не стала цёпла». У якасці назваў падобных збудаванняў выкарыстоўваліся тады словы *мыльня, мовня, мовь* — ад *мыцца*, і *влазня, лазня* — утвораныя па адной версіі ад дзеяслова *лазіць* (месца, куды лазілі: уніз — г. зн. у яму, дзе была печ, уверх — на палок); па другой — ад назоўніка *lazъ* 'выкапаная яма'.

З тых часоў і засталася ў нашай мове цудоўная гаваркая назва *лазня*, вядомая яшчэ палякам *łaźnia* (з XV ст.) і ўкраінцам. У ёй сплятаюцца старажытнасць, сучаснасць і, напэўна, будучыня. Сапраўдныя аматары лазні ведаюць: у *лазню* ходзяць, каб папарыцца (проста памыцца можна і ў ваннай), а для гэтага трэба *залазіць* на палок і *злазіць* з яго — шукаць, як кажуць, сваю пáру, прыдатную для арганізма. У старапольскай мове нават захаваўся такі выраз: «co dalej to wyszsze jako w łaźniej» — «а далей усё вышэй, як у лазні».

У сучаснай беларускай мове слова *лазня* мае і іншыя значэнні: 1) 'сушня, будынак, у якім труць лён': *Праца ў лазні не спынялася да раніцы*; 2) 'мыццё ў такім памяшканні' (разм.): *Змяніць бялізну пасля лазні*; 3) 'наганяй, суровая вымова' (размоўнае ў пераносным значэнні): *Будзе ўсім лазня за невыкананне даручэнняў*; 4) у асобных раёнах Гродзеншчыны лазняй называюць лесвіцу, драбіну. Выкарыстоўваецца яно і ў складзе фразеалагізмаў: *справіць лазню* — 'пакараць, зрабіць вымову, пабіць': *Што ты, цётка, звар'яцела, / Ці мо блёкату пад'ела: / К сляпой лезеш без баязні, / Як угледзіць, справіць лазню* (Янка Купала); *лазні дастаць* і *дастаць лазні* — 'атрымаць наганяй, строгую вымову': *А за гэта сухой лазні не дастанеш ад мамкі і таткі?.. Гэта толькі татка сягоння дастане ад мамкі лазні, бо дома не начаваў* (з п'есы «Прымакі» Янкі Купалы). Ад гэтага слова маюцца шматлікія ўтварэнні: памяншальна-ласкальнае *лáзенька* — 'невялікая лазня', *лáзнік (лáзебнік, лáзеншчык)* — 'работнік лазні, які абслугоўвае наведвальнікаў'; *лáзнішча* — 'месца, дзе была лазня', *лáзневы* — 'які мае адносіны да лазні'.

**Пытанні**

**1.** Якія словы выкарыстоўваліся ў старажытнасці для наймення збудаванняў, дзе людзі мыліся?

1) Мытня;
2) мыльня;
3) моўнік;
4) лазня;
5) мовня.

**2.** Якое значэнне меў назоўнік *lazъ*?

1) дровы і камяні, складзеныя ў кучу;
2) насыпаная гара;
3) выкапаная яма.

**3.** Як перакладаецца з польскай мовы выраз «co dalej to wyszsze jako w łaźniej»?

1) «залезеш вышэй — стане цяплей, як у лазні»;
2) «а далей усё вышэй, як у лазні»;
3) «далей сядзеш, вышэй знойдзеш, як у лазні».

**4.** Да якога стылю маўлення адносіцца тэкст?

1) Канфесійнага;
2) навуковага;
3) публіцыстычнага;
4) гутарковага;
5) мастацкага.

**5.** Якія адказы правільныя?

У сучаснай беларускай мове слова «лазня» мае і іншыя значэнні:

1) сушня, будынак, у якім труць лён;
2) месца, дзе расце лазняк;
3) мыццё ў такім памяшканні;
4) наганяй, суровая вымова;
5) лесвіца, драбіна.

**6.** Якое значэнне мае фразеалагізм *справіць лазню*?

1) Напаліць у печы і зварыць абед;
2) нанасіць вады і прапаліць лазню;
3) пахваліць, узнагародзіць чалавека;
4) пакараць, зрабіць вымову чалавеку, пабіць яго;
5) пакарміць чалавека і пакласці спаць.

**7.** Якія аднакаранёвыя з назоўнікам «лазня» словы маюць указаныя значэнні? Запішыце гэтыя словы.

1) Невялікая лазня;
2) работнік лазні, які абслугоўвае наведвальнікаў;
3) месца, дзе была лазня;
4) які мае адносіны да лазні.

**20.** Прачытайце верш. Вызначце яго тэму, ідэю, вобразныя сродкі, кампазіцыю. Затым прачытайце і прааналізуйце варыянт водгуку па наступнай схеме: 1) колькасць структурных частак і іх тэмы; 2) сродкі сувязі сказаў у абзацах; 3) прыёмы цытавання; 4) змест уступу і заключэння.

### Птушка яе вясны

*Памяці Яўгеніі Янішчыц*

Адзінока на гумнішчы
Сцежка ў травы заплыла.
Жэня, Жэнечка Янішчыц...
Колькі ў імені святла!

З ціхай песняй, як з сястрою,
Па вясне бяжыць яна.
Сукня веснавога строю
І сама нібы вясна.

Быць самотнай між вясёлых
Не хацела, Божа крый.
Шмат крылатых ёсць анёлаў,
Ды ў іх цені заміж крыл.

А ў яе, бы ў той стракозкі,
Крылцы з сонца і слюды.
Праз дажынкі,
Праз дакоскі
Лёт вясёлы, малады.

А над Ясельдаю зоры
Сумна згаснуць, як у сне.
Чорны шалік Айседоры
Сніўся песні і вясне.

І хіснула доля шалі,
І вясны як не было.
Ах, як страшна — чорны шалік
Ды на белае крыло...

*Казімір Камейша.*

### Водгук

Напісанне высокамастацкіх твораў, прысвечаных таленавітым асобам нашай Бацькаўшчыны, з'яўляецца сталай традыцыяй беларускай літаратуры. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова перачытаць верш «Сакольнік» Рыгора Барадуліна, у якім паказана асоба Максіма Багдановіча, баладу Уладзіміра Караткевіча «Шляхі Ігната Буйніцкага», дзе апавядаецца пра «першага вандроўнага артыста», верш Людмілы Рублеўскай «Настаўнік», прысвечаны пачынальніку нашай драматургіі Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, і многія іншыя.

Верш Казіміра Камейшы «Птушка яе вясны» — яшчэ адзін твор-прысвячэнне, які ўзбагачае беларускае прыгожае пісьменства, вылучаецца зграбнай кампазіцыйнай будовай, прадуманай сістэмай мастацкіх сродкаў, знаёміць кожнага неабыякавага чытача з цікавымі жыццёвымі назіраннямі, карыснымі аўтарскімі высновамі. Тэма яго, гэта значыць, прадмет мастацкага ўзнаўлення, — асоба і лёс Яўгеніі Янішчыц. Галоўная думка, увасобленая аўтарам у творы, — заўчасная смерць таленавітага чалавека з'яўляецца трагедыяй для краіны, у якой вінавата часткова і само грамадства.

Штуршком да напісання верша стала трагічная смерць маладой таленавітай беларускай паэткі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы Яўгеніі Янішчыц. Таму цэнтральным мастацкім вобразам твора, вакол якога і разгортваюцца аўтарскія апісанні і разважанні, з'яўляецца сама Яўгенія Янішчыц. Казімір Камейша называе яе ласкава і пяшчотна «Жэня, Жэнечка...» — быццам уласную сястру, параўноўвае з вясной, парой года, калі ўсё цвіце, красуе, выклікае захапленне. На ёй «сукня веснавога крою і сама нібы вясна». У такі час не хочацца думаць пра кепскае, толькі кахаць, весяліцца, радавацца жыццю, любавацца прыгажосцю прыроды. І яна, бы тая «стракозка», як сцвярджае аўтар, вясёлая, маладая, бесклапотная, не ходзіць, а лётае па свеце, дорачы людзям свае песні, дзеліцца з кожным сваім аптымізмам.

Але не ўсё так сонечна было ў жыцці гераіні твора. Вядома, што ў апошнія гады пісьменніца перажывала страшную дэпрэсію, бо не ўсё ладзілася ў сямейных узаемаадносінах. Пра гэтую «чорную» паласу Казімір Камейша гаворыць такімі словамі: «Чорны шалік Айседоры / Сніўся песні і вясне». Айседора Дункан — каханая жанчына Сяргея Ясеніна. Вядома, што яна заўчасна пакінула гэты свет у выніку нечаканага трагічнага выпадку, калі шалік жанчыны выпадкова патрапіў пад колы і спыніў гарачае сэрца прыгажуні. На думку паэта, Яўгенія Янішчыц апынулася перад выбарам: застацца жыць або пакінуць Зямлю і стаць яшчэ адным анёлам Беларусі — светлым, шчырым, неўміручым. Яе можна параўнаць з «промнем сонца», які зіхацеў сваім прыгожым бляскам і раптоўна згас.

«І хіснула доля шалі, / І вясны як не было», — зазначае Казімір Камейша. Гэта значыць, Яўгенія Янішчыц не захацела ўсё жыццё «быць самотнай між вясёлых», не знайшла сілы супрацьстаяць абставінам. У гэтай трагедыі, мне здаецца, ёсць пэўная доля віны і тых, хто жыў побач з ёй, працаваў, сустракаўся. «Шалі», якія згадвае аўтар, маглі б хіснуцца і ў другі бок, каб знайшоўся хтосьці і пераканаў паэтку, падтрымаў у цяжкія хвіліны роздуму, працягнуў руку дапамогі. Але, паводле аўтара, такіх людзей не аказалася побач. Шкада... У выніку наша Радзіма стала бяднейшая яшчэ на адзін талент, што, безумоўна, мог бы ўпрыгожыць яе новымі цудоўнымі радкамі кшталту: «Ты пакліч мяне, пазаві...».

Кампазіцыя лірычнага верша традыцыйная. Маецца загаловак «Птушка яе вясны» і радок-прысвячэнне «Памяці Яўгеніі Янішчыц», якія ўказваюць на тэму. Шэсць строф, што аб'ядноўваюць трынаццаць сказаў (лічба сімвалічная), складаюцца з чатырох радкоў. Толькі ў чацвёртай страфе іх пяць, бо аўтар графічна выдзеліў

ключавыя словы «праз дажынкі, праз дакоскі». У структуры верша, мне здаецца, яны гавораць пра тое, што гераіня рана завяршыла сваю творчую, працоўную дзейнасць, спяшала да нейкага новага, нечаканага кроку.

Моўна-вобразная сістэма верша дае ўяўленне пра асобу аўтара, спецыфіку яго паэтычнага мыслення. Адной з галоўных крыніц вобразнасці з'яўляецца іншасказальнасць слова — выкарыстанне лексікі ў пераносным значэнні. Сустракаем тут метафарычныя выразы «сцежка заплыла», «доля хіснула шалі», «бяжыць па вясне», «лёт вясёлы, малады», параўнальныя канструкцыі «сама нібы вясна», «бы ў той стракозкі», алюзія «шалік Айседоры». Пры дапамозе іх раскрываецца вобраз Яўгеніі Янішчыц. Трагізм жа сітуацыі перадаецца, як правіла, лексікай агульнаўжывальнай, добра зразумелай нават непадрыхтаванаму чытачу. Гэта і антонімы «чорны шалік і белае крыло», і назва ракі, дзе прайшло дзяцінства паэткі, — *Ясельда*, якая таксама сумуе па заўчаснай гібелі сваёй выхаванкі, *зоры, адзінокая сцежка*. Аўтар мне ўяўляецца натурай паэтычна тонкай, дасведчаным чалавекам. Ён, хутчэй за ўсё, быў знаёмы са сваёй гераіняй, наведваў яе родныя мясціны, бачыў адзінокую сцежку, гумнішча. І ён не асуджае ўчынак Янішчыц, як не асуджае і людзей «вясёлых» у тым, што здарылася.

На заканчэнне хацелася б сказаць наступнае. Вельмі часта здараецца так, што лепшыя прадстаўнікі роду чалавечага ідуць з жыцця раней часу. З гісторыі рускай літаратуры можна прыгадаць Аляксандра Пушкіна, Уладзіміра Маякоўскага, Міхаіла Лермантава, з беларускай — Максіма Багдановіча ці Анатоля Сыса. Прычыны пакінуць гэты свет у кожнага былі розныя. Але адна з іх відавочная — само грамадства. На мой погляд, жыццём варта даражыць, любіць яго. І трэба рабіць усё магчымае, каб не дапусціць заўчаснай смерці. Імкнуцца дапамагчы знаёмаму ці незнаёмаму чалавеку паверыць у свае сілы, адчуць радасць, асалоду ад рэальных жыццёвых клопатаў. Адным словам, варта заўважаць не толькі шчаслівыя хвіліны ў жыцці суседа, але і трывогу на сэрцы. Імкнуцца быць побач са сваімі блізкімі ў адказны час.

**21.** Напішыце самастойна водгук на верш.

**Стрэлкі гадзінніка**

Стрэлкі гадзінніка — ножніцы
Нястомнага краўца,
Які дзень і ноч
Кроіць час
І шые мне з яго вопратку.

Якіх ён за век
Не нашыў мне дзівосных убораў!

Была ў мяне вопратка пастуха,
Што пахла малаком, травой,
Гулам берасцянкі.
Была ў мяне
Вопратка аратага,
Прасоленая потам, сонцам,
Пылам зямлі.

Была ў мяне вопратка вязня,
Расшытая дротам калючым
І ценем крат.

Была ў мяне вопратка салдата,
Абвеяная дымам родных папялішчаў.

І простая блуза рабочая,
У якой найлепш я чуўся.
А колькі было маскарадных касцюмаў —
Рамэа,
Дон Кіхота,
Фаўста —
Стракатых, бліскучых і яркіх!
Ніводнага касцюма не паспеў знасіць.
Ножніцы гадзінніка выразалі новы.

Вось і цяпер
На мне яшчэ зусім прызваіты касцюм
Грузчыка чалавечых надзей,
Разведчыка будучыні.

Касцюм, які мог бы насіць яшчэ,
Можа, паўсотні гадоў.

А стрэлкі гадзінніка
Крояць мне новы.

Толькі я ўсё збіраюся
І не магу запытацца ў краўца:
Чаму ён мне вопратку шые
З усё больш і больш цёмнага
Матэрыялу?

*Максім Танк (1966).*

## Даведкі

1 — 2, 5.

2 — 1, 3, 4.

3. З'яўленне першага гука [а] абумоўлена законам акання, г. зн. пераходам ненаціскнога гука [о] ў гук [а]. Спалучэнне *ія* замест *еа* тлумачыцца тым, што для фанетыкі беларускай мовы нехарактэрнымі з'яўляюцца спалучэнні двух галосных гукаў у межах адной марфемы. Таму паміж такімі галоснымі ў многіх словах з'яўляецца гук [j], які, згодна з нормамі беларускай арфаэпіі, павінен вымаўляцца выразна. Напрыклад: *педыятр*, *сіямскі*, *біёлаг*.

4. 1) Крывіч — крывіцкі; 2) Сілезія — сілезскі; 3) Баранавічы — баранавіцкі; 4) рамеснік — рамесніцкі; 5) Ірак — іракскі; 6) грамадства — грамадскі; 7) латыш — латышскі; 8) начальнік — начальніцкі.

5 — 3, 4.

6 — 2 (трэба: *дзвярыма*), 3 (трэба: *коней*), 4 (трэба: *гора* і *слёз*), 5 (трэба: *кансерваў*).

7 — 5.

**8.** Я гасцюю, драмлю, дзяўбу, гашчу, тру, пяку, ламлю, ем.

**9** — А3, Б4, В2, Г5, Д2.

**10** — 2, 5.

**11** — 4.

**12** — 2.

**13** — 2, 3, 5.

**14** — 1, 5, 6, 8.

**15.** Кішэннага фармату кніжка змяшчае мноства цікавых фактаў з гісторыі краіны і народа. Асноўны (практычны) матэрыял складаецца з сямі актуальных раздзелаў: «Агульнаўжывальныя словы і выразы»; «Маўленчы этыкет»; «Чалавек. Асоба»; «У горадзе»; «У магазіне»; «Харчаванне»; «Здароўе і спорт». Такая структура спрыяе зручнаму пошуку патрэбнага слова або фразеалагізма, іх беларускіх эквівалентаў. Упэўнены, размоўнік дапаможа не толькі рускамоўным асобам, але і нам, беларусам, удасканаліць сваё маўленне і пазнаёміцца з самабытнымі словамі і канструкцыямі: *коротать время вечером — вечараваць, лето следующего года — налёцце, перед рассветом — нацямочку, участник застолья, званый гость — бяседнік* і г. д.

**16** — А3Б8В5Г7Д4Е1Ж2З6.

**17** — 1) Зарубіць сабе на носе. 2) Чуць на свае вушы. 3) Не з тваімі рукамі. 4) На ўсе лады. 5) Скінуць з сябе ветхага Адама. 6) Перарабіць на свой капыл.

**18.**

| Слова | Азначэнне | Род |
|---|---|---|
| посуд | *сталовы* | *мужчынскі* |
| плешн | *вялікі* | *мужчынскі* |
| горыч | *нечаканая* | *жаночы* |
| небарака | *малы, малая* | *агульны* |
| абцугі | *сталёвыя* | *адсутнічае катэгорыя роду* |
| каліва | *маленькае* | *ніякі* |

**19:** 1 — 2, 4, 5; 2 — 3; 3 — 2; 4 — 1; 5 — 1, 3, 4, 5; 6 — 4; 7 — 1) лазенька; 2) лазнік (лазебнік, лазеншчык); 3) лазнішча; 4) лазневы.

**Г. У. БАНДАРЭНКА,**
настаўніца вышэйшай катэгорыі Магілёўскай гарадской гімназіі № 1

# ЗАДАННІ АЛІМПІЯДНАГА ЎЗРОЎНЮ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: ПРАКТЫКУМ

## (X—XI класы)

**Прапанаваныя заданні па раздзеле «Лексіка. Фразеалогія», думаецца, дапамогуць настаўнікам не толькі на ўроках, прысвечаных вывучэнню лексікі беларускай мовы, а і на любым іншым уроку ці ў час падрыхтоўкі да алімпіяд паказаць слова ў яго сістэмна-лексічных сувязях, узбагаціць беларускамоўны слоўнікавы запас вучняў, раскрыць значэнне малавядомых слоў ці фразеалагізмаў. Хочацца думаць, што настаўнікам важна не толькі веданне вучнем марфалагічных характарыстык слова, а найперш тое, што значыць гэтае слова, якія асацыяцыі ўзнікаюць, калі чуеш тое ці іншае слова.**

### Паходжанне і ўжыванне слоў

**1.** Да прыведзеных слоў падбярыце адпаведнікі з рускай мовы, запішыце парамі. Вызначце, якія словы і чаму можна лічыць уласнабеларускімі.

Буйны, гаманіць, босы, канаць, барацьбіт, будынак, аглобля, ажыны, асяроддзе, гарлачык, весялун, балота, карычневы, адвячорак, палатно, асака, змрок.

**2.** Гэтыя два тэрміны з грэчаскай мовы сталі ўжывацца замест: а) двухслоўнай назвы *склад мовы*; б) назваў *блізказначнік, падобназначнік*.

**3.** Вызначце паходжанне запазычаных слоў. Падкрэсліце тыя апазнавальныя прыметы, на аснове якіх вызначаецца іх паходжанне.

Авіяцыя, вяндліна, тлусты, манцёр, дуэль, псіхалогія, штаб, мітынг, шахта, космас, утрапёны, дырыжор.